Весці БДПУ. Серыя 2. 2018. № 2. С. 6–12

*УДК 94(476)"1901/1914"*

# СТВАРЭННЕ ГУБЕРНСКІХ ПРЫСУТНАСЦЕЙ У БЕЛАРУСІ Ў ПАЧАТКУ XX ст.[1]

**С. А. Талмачова,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў БДПУ*

Паступіў ў рэдакцыю 15.04.18.

*UDC 94(476)"1901/1914"*

# CREATION OF GOVERNORSHIP OFFICES IN BELARUS IN THE BEGINNING OF THE XX CENTURY

**S. Talmachyova,**
*Phd (History), Associate Professor of the Department of the History of Belarus and Slavic Nations, BSPU*

Received on 15.04.18.

Губернскія прысутнасці былі створаны на падставе закона ад 12 ліпеня 1889 г. Яны сталі правапераемнікамі губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей. Яны з'яўляліся вышэйшай мясцовай інстанцыяй для разгляду і вырашэння сялянскіх спраў і кіравання дзейнасцю павятовых устаноў. Аднак у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях губернскія прысутнасці былі створаны толькі ўвосень 1901 г., а у Віленскай і Гродзенскай губернях – у снежні 1903 г. У артыкуле паказаны прычыны адтэрміноўкі рэфармавання мясцовых устаноў, кадравы склад прысутнасцей і сфера іх кампетэнцыі. Вызначаны асаблівасці фарміравання кадравага складу неадменных членаў і дзейнасці губернскіх прысутнасцей.

*Ключавыя словы:* Беларусь, губернская прысутнасць, неадменны член, земскі начальнік, кадравы склад, мясцовае кіраванне, сялянства.

Governorship offices were created on the base of the law from 12 July 1889. They became the legal successors of governorship offices on peasant affairs. Governorship offices were the highest local institution for considering and solving peasant affairs and for administration of district offices. However, in Vitebsk, Minsk and Mogilev provinces the governorship offices were created only in autumn 1901; in Vilna and Grodno provinces they were created in December 1903. The article shows the reasons of the delay of reforming the local offices, the cadre and the sphere of their competence. It defines the features of forming the cadre of indispensable functionaries and the activity of governorship offices.

*Keywords:* Belarus, governorship office, indispensable functionary, land captain, the cadre, local administration, peasantry.

Губернскія прысутнасці – органы мясцовага дзяржаўнага кіравання, створаныя для кіраўніцтва сялянскімі ўстановамі. Яны сталі правапераемнікамі губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей і былі ўтвораны ў выніку рэалізацыі закона ад 12 ліпеня 1889 г. аб земскіх начальніках. Пры гэтым на тэрыторыі Беларусі названыя пераўтварэнні праводзіліся значна пазней і з пэўнымі змяненнямі: у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях – з восені 1901 г., а ў Віленскай і Гродзенскай губернях – са снежня 1903 г. Прычынай адтэрміноўкі стала тое, што інстытут земскіх начальнікаў фарміраваўся з выбарных прадстаўнікоў мясцовага паменага дваранства. Аднак пасля паўстання 1863–1864 гг. урад з недаверам адносіўся да вышэйшага саслоўя Беларусі рымска-каталіцкага веравызнання, якога была пераважная большасць. Тым больш, што апошнія дваранскія выбары адбыліся ў студзені 1859 г. Мясцовыя губернатары неаднаразова выказваліся аб неабходнасці стварэння інстытута земскіх начальнікаў і губернскіх прысутнасцей па асобных правілах. У выніку шматразовых разглядаў праектаў на розных узроўнях новыя ўстановы паэтапна былі ўведзены і на тэрыторыі Беларусі [1].

Губернскія прысутнасці адыгрывалі важную ролю ў мясцовым кіраванні, але іх дзейнасць не знайшла спецыяльнага вывучэння ў айчыннай гістарыяграфіі.

У адпаведнасці з законам ад 12 ліпеня 1889 г. губернскую прысутнасць узначальваў губернатар. У яе склад уваходзілі губернскі

[1] Артыкул падрыхтаваны ў рамках выканання дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» на 2016–2020 гг. і пры падтрымцы Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў.

прадвадзіцель дваранства, віцэ-губернатар, пракурор акруговага суда і 2 неадменныя члены. Акрамя названых асоб, на пасяджэнне губернскай прысутнасці на правах яго членаў запрашаліся: старшыня або член акруговага суда, кіраўнікі казённай палатай і дзяржаўнымі маёмасцямі і старшыня губернскай земскай управы, калі разглядаемыя пытанні тычыліся іх кампетэнцыі (арт. 105) [2, с. 521].

Неадменныя члены губернскай прысутнасці вылучаліся з мясцовых дваран губернатарам пры ўзгадненні з губернскім прадвадзіцелем дваранства. Прэтэндэнты на пасаду павінны былі праслужыць у губерні не менш трох гадоў у якасці прадвадзіцеля дваранства, неадменнага члена губернскай ці павятовай па сялянскіх справах прысутнасці, міравога суддзі або земскага начальніка. Канчатковае прызначэнне неадменных членаў зацвярджалася імператарам па хадайніцтве міністра ўнутраных спраў. На неадменных членаў прысутнасці, акрамя падрыхтоўкі дакладаў, ускладаўся кантроль за правільным вядзеннем справаводства і выкананнем розных даручэнняў прысутнасці. Губернская прысутнасць мела сваю канцылярыю, якую ўзначальваў прызначаны губернатарам сакратар [3, с. 183–184].

Неадменны член губернскай прысутнасці быў штатным чыноўнікам V класа. Ён атрымліваў жалавання 1200 руб., сталовых 650 руб., кватэрных 650 руб., а усяго – 2500 руб. штогод. Пасля заканчэння службы меў права на пенсію III разраду 1 ступені. Сакратар губернскай прысутнасці адпавядаў VII класу чыноўніцкай іерархіі, атрымліваў сумарна 1500 руб. штогод і меў права на пенсію IV разраду [2, с. 249]. Сродкі на ўтрыманне губернскіх прысутнасцей і іх штатаў выдаткоўваліся з дзяржаўнага казначэйства. Пры гэтым у законе 1889 г. адзначалася, што ў губернях, дзе не адбываліся дваранскія выбары, неадменныя члены і сакратары губернскіх прысутнасцей, акрамя жалавання па службе, захоўвалі таксама пенсіі за папярэднюю службу (арт. VI, п. 2) [2, с. 249]. Гэты пункт у далейшым быў істотным пры фарміраванні кадравага складу мясцовага кіравання ў Беларусі.

Закон 19 ліпеня 1889 г. у беларускіх губернях быў распаўсюджаны толькі ў пачатку XX ст. і паэтапна.

12 чэрвеня 1900 г. быў падпісаны ўказ, у адпаведнасці з якім з 1 студзеня 1901 г. закон ад 12 ліпеня 1889 г. распаўсюджваўся ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях [4, с. 762–764]. Пры гэтым былі ўнесены пэўныя змены, абумоўленыя асаблівасцямі палітычнага становішча ў краі. У прыватнасці, неадменныя члены губернскіх прысутнасцей, а таксама земскія начальнікі прызначаліся парадкам, усталяваным для губерняў, дзе не адбываліся дваранскія выбары (арт. 2) [4, с. 762].

На зацвярджэнне Мікалая II перадаваліся праекты роспісаў колькасці земскіх участкаў, функцыянальныя земскіх начальнікаў і іх павятовых з’ездаў. У прыватнасці, асобна вызначаліся справы па пазямельным уладкаванні сельскіх вечных чыншавікоў. На міністра ўнутраных спраў ускладалася размеркаванне паміж губернскімі і павятовымі прысутнасцямі 6100 руб. на пазямельнае ўладкаванне сельскіх вечных чыншавікоў у трох названых губернях [4, с. 763].

На ўтрыманне трох губернскіх прысутнасцей з 1901 г. выдаткоўвалася 31 500 руб. штогод, а на «усиление канцелярских средств» губернскіх прысутнасцей – 6000 руб. штогод. Адзначым, што законам 1889 г. на «канцелярские и хозяйственные расходы» кожнай губернскай прысутнасці выдаткоўвалася па 4000 руб. штогод [2, с. 249]. Дадатковае фінансаванне было звязана з вялікай колькасцю пазямельных спраў у беларускіх губернях. Асобна вызначалася сума на ўтрыманне двух паверачных землемераў пры губернскіх прысутнасцях: Віцебскай – 1000 руб. і Мінскай – 1600 руб. штогод. У Магілёўскай губерні такія пасады не прадугледжваліся. Асобна ў распараджэнне міністра ўнутраных спраў выдаткоўваліся 19 400 руб. на межавыя работы па пазямельным уладкаванні сельскіх абывацелей у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях [4, с. 763–764].

Аднак увядзенне новых мясцовых устаноў у Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях з 1 студзеня 1901 г. не адбылося. Ва ўказе Мікалая II ад 17 ліпеня 1900 г. адзначалася, што «вследствие происходящих на востоке событий ныне же принять по всем ведомствам настоятельные меры к уменьшению расходов, не только не испрашивая никаких сверхсметных ассигнований, но и сокращая издержки на потребности, хотя и предвиденные по сметам и к производству разрешенные, но могущие быть отложенными» [5, л. 1]. У сувязі з гэтым 27 ліпеня 1900 г. міністр фінансаў у афіцыйным паведамленні міністру ўнутраных спраў адзначыў неабходнасць адтэрміноўкі ўвядзення новых устаноў у названых трох губернях не менш чым на адзін год, паколькі «настоящий порядок заведывания этими учреждениями, действующий в течение столь продолжительного срока, может быть продолжен на некоторое время» [5, л. 2–3 адв.]. 14 жніўня 1900 г. старшыня Дэпартамента дзяржаўнай эканоміі Дзяржаўнага савета Д. М. Сольскі, міністр фінансаў С. Ю. Вітэ і таварыш дзяржаўнага кантралёра А. П. Івашчанкаў прадставілі да-

клад імператару, у якім прапанавалася адтэрміноўка меркаванага раней рэфармавання [5, л. 1–1 адв.].

Міністр унутраных спраў лічыў мэтазгодным увядзенне новых устаноў у названых трох губернях не пазней чым з 1 ліпеня 1901 г. Ён прадставіў новы каштарыс, у адпаведнасці з якім выдаткі на іх увядзенне скарачаліся з 500 000 руб., праектаваных раней, да 266 334 руб. [5, л. 2]. Міністр унутраных спраў апасаўся, што адтэрміноўка рэформы на адзін год зацягне ўвядзенне тут Палажэння аб парадку спагнання акладных збораў ад 23 чэрвеня 1899 г., якое дзейнічала толькі ў тых губернях, дзе іcнавалі земскія начальнікі ці міравыя пасрэднікі [6, с. 804–815]. Ён адзначаў, што «скорейшее принятие мер по упорядочению взимания окладных сборов составляет вопрос первостепенной важности; всякая продолжительная отсрочка его разрешения невыгодно отзовется на интересах сельского населения и государства» [5 л. 4–4 адв.]. Справа ў тым, што з 1861 г. адказнасць за спагнанне грошай ускладалася на міравых пасрэднікаў, а з рэфармаваннем мясцовых устаноў па ўзоры 1874 г. гэтыя абавязкі перадаваліся павятовым спраўнікам, якія былі абцяжараны і іншымі справамі. Таму ў большасці выпадкаў адказнасць за спагнанне акладных збораў перадавалася ў рукі ніжэйшых паліцэйскіх чыноў – станавых прыставаў і наватураднікаў, якія былі зацікаўлены пераважна толькі ў фармальным выкананні каштарысаў [5, л. 3 адв. – 4].

Міністр юстыцыі М. В. Мураўёў падтрымаў прапанову міністра ўнутраных спраў і лічыў магчымым увядзенне новых устаноў з 1 ліпеня 1901 г. [5, л. 31]. Пасля абмеркаванняў прапановы Дзяржаўнага савета паступілі да Мікалая ІІ, які іх зацвердзіў 4 студзеня 1901 г. У адпаведнасці з імі прапанавалася міністрам унутраных спраў і юстыцыі пасля ўзгаднення з міністрам фінансаў распаўсюдзіць дзеянне закона ад 12 чэрвеня 1889 г. на Віцебскую, Магілёўскую і Мінскую губерні ў апошняй чвэрці 1901 г. [7, с. 8].

Падрыхтоўка да рэалізацыі закона пачалася адразу. Напрыклад, 4 ліпеня 1901 г. на пасяджэнні Віцебскай губернскай па сялянскіх справах прысутнасці быў вызначаны падрабязны парадак перадачы спраў новым установам. Неабходна было вызначыцца з іх кадравым складам. 28 жніўня 1901 г. Віцебскі губернатар І. І. Чэпелеўскі атрымаў паведамленне ад кіруючага Земскім аддзелам Міністэрства ўнутраных спраў Савіча (№ 16 581) аб зацвярджэнні кандыдатур неадменных членаў Віцебскай губернскай прысутнасці [8, с. 50]. У гэтым жа дакуменце вызначаўся асабовы склад земскіх начальнікаў. 1 кастрычніка 1901 г. Віцебская губернская прысутнасць была адкрыта. Яна складалася з двух аддзяленняў – адміністрацыйнага і судовага. Старшынёй першага быў губернатар І. І. Чапялеўскі, членамі: губернскі прадвадзіцель дваранства А. Г. Нолькен, віцэ-губернатар А. С. Ключараў, пракурор акруговага суда П. К. Камышанскі, кіруючы казённай палатай М. А. Вінаградаў, кіруючы дзяржаўнымі маёмасцямі А. А. Апсаітаў, а таксама неадменныя члены М. М. Чаплін, М. І. Ісаеў і П. Г. Доппельмайер. Склад другой часткі прысутнасці шмат у чым дубліраваў першую: губернатар (старшыня), губернскі прадвадзіцель дваранства, віцэ-губернатар, старшыня акруговага суда І. І. Саллерцінскі, пракурор акруговага суда і неадменныя члены. Сакратаром прысутнасці быў прызначаны М. А. Фашчэўскі [8, с. 60; 9, с. 3, 7, 12, 22, 27, 30].

У Мінскай губерні ў 1901 г. неадменнымі членамі прысутнасці з’яўляліся А. М. Замятнін, Д. У. Радзевіч і А. А. фон-Брынкман, сакратар – В. О. Хрысталюбаў. Трэба дадаць, што, акрамя членаў прысутнасці па пасадзе (старшыня – губернатар М. М. Трубецкой, губернскі прадвадзіцель дваранства А. Г. Рацькоў-Ражноў, віцэ-губернатар А. М. Вельямінаў, кіруючы казённай палатай Ф. М. Ястрэмскі, кіруючы дзяржаўнымі маёмасцямі І. Р. Базілевіч, пракурор акруговага суда А. Э. Барцельсан і член ад землеўладальнікаў), у склад судовага аддзялення Мінскай губернскай прысутнасці замест кіруючых казённай палатай і дзяржаўнымі маёмасцямі, а таксама члена ад землеўладальнікаў уваходзіў старшыня ці член акруговага суда. У складзе Мінскай губернскай прысутнасці быў і паверачны землемер прысутнасці М. А. Пржэляскоўскі [10, с. 51, 53–54, 66, 69, 75].

Магілёўская губернская прысутнасць складалася з губернатара М. К. Семякіна (старшыня), членаў па пасадзе: губернскага прадвадзіцеля дваранства А. П. Фрамандзіера, старшыні акруговага суда В. Ф. Рэйнбата, віцэ-губернатара А. А. Вяземскага, кіруючага казённай палатай В. В. Віндзінга і пракурора акруговага суда У. М. Нячаева, а таксама неадменных членаў А. М. Каралько, А. В. Асасова і М. М. Барданоса. Сакратаром быў прызначаны К. А. Ляховіч [11, с. 10, 16, 23, 33, 38].

Такім чынам, 1 кастрычніка 1901 г. новыя ўстановы, створаныя на падставе законаў ад 12 ліпеня 1889 г. і 12 чэрвеня 1900 г., былі адкрыты ў Віцебскай губерні [8, с. 52; 12, л. 48 адв.], а ў Магілёўскай і Мінскай губернях – з 1 лістапада 1901 г. [13, л. 76–77; 14, л. 151 адв.]. Галоўная ўвага надавалася дзейнасці земскіх начальнікаў. Аб гэтым сведчыць запіс імператара на дакладзе міністра ўнутраных спраў: «Благодарю за выраженные чув-

ства и надеюсь, что земские начальники и в Белорусских губерниях принесут такую же пользу, какую они принесли в других местностях России» [8, с. 52]. Мяркуем, што імператар быў упэўнены ў паспяховай дзейнасці губернскіх прысутнасцей, якія ўзначальваліся губернатарамі.

Кампетэнцыя губернскіх прысутнасцей вызначалася як па адміністрацыйных, так і судовых справах у дачыненні да дзейнасці земскіх начальнікаў, іх з'ездаў, органаў сялянскага самакіравання. Да абавязкаў губернскай прысутнасці адносілася і рэвізія работы сялянскіх ўстаноў. Штогадовыя рэвізіі былі закліканы прывесці ў адпаведнасць з заканадаўствам дзейнасці земскіх начальнікаў і органаў сялянскага самакіравання. Як адзначаў неадменны член Віцебскай губернскай прысутнасці А. В. Арапаў, дзейнасць Віцебскай губернскай прысутнасці аб'яднала сялянскія ўстановы і «поставила все крестьянское дело на должную высоту, и с каждым годом наблюдается все меньше и меньше со стороны должностных лиц и учреждений промахов и ошибок, а единичные злоупотребления не остаются безнаказанными» [8, с. 57–58].

На пасяджэннях Магілёўскай губернскай прысутнасці вырашаліся справы аб выкупе зямлі сялянамі, пазямельных спрэчках сялян і іншых асоб, скаргах на рашэнні павятовых з'ездаў земскіх начальнікаў, сялянскіх перасяленнях на свабодныя землі ў Сібір, на Далёкі Усход і іншыя месцы імперыі [3, с. 184–185].

8 чэрвеня 1901 г. Мікалай ІІ загадаў міністру ўнутраных спраў падрыхтаваць і прадставіць у Дзяржаўны савет праект закона аб распаўсюджанні рэформы 1889 г. на астатнія 6 заходніх губерняў, у тым ліку на Віленскую і Гродзенскую. 29 сакавіка 1902 г. міністр унутраных спраў Д. С. Сіпягін накіраваў міністру юстыцыі М. В. Мураўёву свой праект. 18 чэрвеня 1902 г. М. В. Мураўёў у адозве да новага міністра ўнутраных спраў В. К. Плеве пагадзіўся з прапанаваным праектам [5, л. 7–19 адв.]. Новыя ўстановы прапаноўвалася ўвесці з 1 ліпеня 1903 г.

15 кастрычніка 1902 г. Міністэрства фінансаў таксама выказала свае меркаванні наконт праекта. У прыватнасці, міністэрства імкнулася да скарачэння дзяржаўных выдаткаў і нават выказала думку аб тым, што рэфармаванне мясцовых па сялянскіх справах устаноў у шасці заходніх губернях можна адкласці на больш позні тэрмін [5 л. 26]. У першую чаргу міністэрства звяртала ўвагу на велічыню новых выдаткаў, звязаных з увядзеннем названых устаноў. Штогадовыя выдаткі ў шасці губернях праектаваліся ў суме 1 717 040 руб., без уліку выдаткаў на пазямельнае ўладкаванне сельскіх вечных чыншавікоў і межавыя работы. Гэтыя выдаткі былі на 1 278 250 руб. большымі ў параўнанні з існаваўшымі на ўтрыманне ўстаноў па сялянскіх справах [5, л. 25]. Акрамя таго, адзначалася, што названыя ўстановы былі створаны і дзейнічалі на падставе Палажэнняў 1861 г., а «успешность деятельности существующих в 6 западных губерниях крестьянских учреждений подтверждается, между прочим, почти полным завершением в высшей степени важной и сложной работы по устройству хозяйственного быта крестьянского населения края» пацвярджала іх жыццядзейнасць [5, л. 25 адв.]. Пры гэтым прапанаваліся некаторыя меры па памяншэнні выдаткаў на ўтрыманне новых па сялянскіх справах устаноў за кошт скарачэння колькасці участкаў земскіх начальнікаў і інш. [5, л. 26 адв.–30].

У выніку доўгіх абмеркаванняў было вырашана распаўсюдзіць палажэнне 12 ліпеня 1889 г. толькі на тры заходнія губерні з шасці. 8 чэрвеня 1903 г. Мікалай ІІ зацвердзіў меркаванне Дзяржаўнага савета «О распространении законоположений 12 июля 1889 г. на губернии Виленскую, Гродзенскую и Ковенскую и об ассигновании необходимых на сие кредитов» [15]. Мясцовыя ўстановы па сялянскіх справах у Валынскай, Кіеўскай і Падольскай губернях заставаліся без змяненняў.

Новыя ўстановы ўводзіліся на падставе закона ад 12 ліпеня 1889 г. і 12 чэрвеня 1900 г. з пэўнымі зменамі. Па законе ад 8 чэрвеня 1903 г. члены губернскіх прысутнасцей, як і ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях, прызначаліся парадкам, усталяваным для губерняў, дзе не праводзіліся дваранскія выбары (ч. І, арт. 1). Пастановы губернскіх прысутнасцей аб звальненні земскіх начальнікаў прадстаўляліся праз губернатараў на вырашэнне генерал-губернатару (ч. І, арт. 3), а не міністру ўнутраных спраў, як патрабаваў арт. 18 Палажэння 1889 г. Генерал-губернатару падаваліся і скаргі на пастановы губернскай прысутнасці, а ён зацвярджаў ці адмяняў апошнія (ч. І, арт. 5). Асобна адзначаўся абавязак па пазямельным уладкаванні былых вольных людзей другога разраду, а таксама разбор магчымых спрэчак паміж імі і землеўладальнікамі (ч. ІІІ, арт. 3).

Пры гэтым дакладны тэрмін увядзення новых устаноў не вызначаўся, толькі адзначалася: «Предоставить министрам внутренних дел и юстиции настоящее узаконение, в отношении губерний Виленской, Гродненской и Ковенской ввести в действие в 1903 году, в срок по ближайшему усмотрению их, с тем, чтобы вызываемые указанною мерою в сем году расходы не превышали ассигнованных на означенный предмет кредитов» (ч. ХІ) [15].

27–29 лістапада 1903 г. у г. Вільне адбыўся з'езд, на якім урачыста было абвешчана ўвядзенне ў губерні ўстаноў па Палажэнні 1889 г. На з'ездзе выступіў губернатар К. К. Пален, які паведаміў аб адказнасці і важнасці працы рэфармаваных устаноў [16]. Яны пачалі сваю дзейнасць з 1 снежня 1903 г. [17, с. 89]. У склад Віленскай губернскай прысутнасці ўвайшлі: губернатар К. К. Пален (старшыня), члены па пасадзе: губернскі прадвадзіцель дваранства А. С. дэ-Броэль-Плятэр, віцэ-губернатар А. С. Даўгова-Сабураў, кіруючы казённай палатай С. В. Катляроў, начальнік упраўлення дзяржаўных маёмасцей І. А. Лявіцкі і пракурор акруговага суда М. М. Дземчынскі, а таксама неадменныя члены В. С. Барташэвіч, Ф. А. Іваноў, В. А. Лапухін. У склад прысутнасці на правах неадменнага члена ўваходзіў таксама чыноўнік перасяленчага ўпраўлення МУС С. П. Рахманін. Сакратаром быў прызначаны Д. І. Папоў [18, с. 1, 8, 18, 35, 48, 80]. Пры высвятленні першага кадравага складу прысутнасці ўзніклі пэўныя цяжкасці. Так, у афіцыйным выданні «Адрес-календарь. Общая роспись начальствующих и прочих должностных лиц по всем управлениям в Российской империи на 1904 год» у Віленскай губерні як быццам па-ранейшаму існавала губернская па сялянскіх справах прысутнасць, а склад неадменных членаў адрозніваўся – Л. Л. Бекляшоў і В. А. Лапухін [19, с. 18]. Пры параўнанні прыведзеных звестак з данымі выдання МУС «Список лиц, служащих по ведомству Министерства внутренних дел в губерниях, областях и градоначальствах, а также высших чинов губерний и областей, не подведомственных Министерству внутренних дел» за 1905 г., высветлілася наступнае. У названым выданні прыведзены звесткі аб пачатку службы на пасадзе. У час складання даведніка ў губернскай прысутнасці лічыліся ў якасці неадменных членаў Ф. А. Іваноў і Л. Л. Бекляшоў, якія займалі пасады з часу ўтварэння губернскіх прысутнасцей, г. зн. з 1 снежня 1903 г., а пасада трэцяга члена заставалася вакантнай [20, с. 54–55]. Параўнанне за данымі за 1903 г. не мела сэнсу, таму што даведнік складаўся значна раней, чым былі зацверджаны спісы кадравага складу новых устаноў па сялянскіх справах.

Гродзенская губернская прысутнасць таксама пачала сваю дзейнасць з 1 снежня 1903 г. Кадравы склад установы быў аналагічным Віленскай губернскай прысутнасці. Неадменнымі членамі былі прызначаны У. У. Сталяроў, М. О. Шчарбніцкі і Д. В. Рамейкаў, а сакратаром – П. Л. Трысветаў [19, с. 67]. Праверка па іншых крыніцах пацвердзіла дакладнасць прыведзеных даных. Усе названыя асобы займалі пасады з 1 снежня 1903 г. [20, с. 157].

Важнай істотнай асаблівасцю кадравага складу губернскіх прысутнасцей Беларусі было існаванне ў штаце трох неадменных членаў, замест двух, прадугледжаных Палажэннем 1889 г. Звязана гэта было з вялікай колькасцю і складанасцю спраў па пазямельным уладкаванні розных катэгорый сельскага насельніцтва, якіх не існавала ў іншых губернях Расійскай імперыі. У некаторых выпадках у склад губернскай прысутнасці на правах неадменных членаў уводзіліся чыноўнікі пэўных міністэрстваў. Напрыклад, у склад Магілёўскай прысутнасці ўваходзіў член па справах перасялення, чыноўнік Перасяленчага ўпраўлення МУС М. М. Барданос, які з'яўляўся членам аддзялення Сялянскага пазямельнага банка [11, с. 16]. У склад Віленскай губернскай прысутнасці ў 1908 г. быў прызначаны чыноўнік асобых даручэнняў Галоўнага ўпраўлення землеўладкавання і земляробства для выканання абавязкаў неадменнага члена па справах землеўладкавання [21, с. 25].

Такім чынам, рэфармаванне мясцовых устаноў па сялянскіх справах ажыццявілася на тэрыторыі Беларусі толькі ў пачатку ХХ ст. у два этапы. У Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях гэта было зроблена раней, таму што тут існавалі калегіяльныя павятовыя па сялянскіх справах прысутнасці, неадменныя члены якіх былі вельмі загружаны канцылярскай работай, а таксама не мелі паўнамоцтваў асабістай уладай аператыўна вырашыць пытанні і спрэчкі сярод сельскага насельніцтва. З гэтай прычыны справы па пазямельным уладкаванні і па скаргах на дзеянні органаў сялянскага самакіравання зацягваліся на доўгі час. У Віленскай і Гродзенскай губернях такімі пытаннямі займаліся міравыя пасрэднікі і іх павятовыя з'езды, таму сітуацыя тут складалася менш драматычная. Галоўнай прычынай адтэрміноўкі рэфармавання структуры органаў мясцовага кіравання з іншымі губернямі імперыі было апасенне ўрада ў наданні шырокіх паўнамоцтваў земскім начальнікам з мясцовага дваранства, пасада якіх прадугледжвалася палажэннем 12 ліпеня 1889 г. у якасці «блізкай да народа ўлады». Аднак імкненне ўрада да ўніфікацыі і больш эфектыўнай дзейнасці органаў мясцовага кіравання і суда дазволіла правесці рэформу, але з улікам асаблівасцей палітычнага і эканамічнага стану губерняў Беларусі.

*Літаратура*


1. *Талмачова, С. А.* Увядзенне закона аб земскіх начальніках у Беларусі / С. А. Талмачова // Весці БДПУ. – 2013. – Сер. 2, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – № 4. – С. 11–15.
2. Высочайше утвержденные: I. Положение о земских участковых начальниках, II. Правила об устройстве судебной части в местностях, в которых введено означенное Положение, III. Временные правила о волостном суде в тех же местностях и IV. Правила о порядке приведения в действие Положения о земских участковых начальниках // ПСЗРИ. Собр. 3-е : в 33 т. – Т. 9 (1889). – Отд. I. – № 6196. – С. 508–535; Отд. II : Штаты и табели. – К № 6196 – 1889. Июля 12. – С. 249.
3. Могилевская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1772–1917) / Е. К. Анищенко [и др.] ; сост. Б. Н. Снапковский, Д. Л. Яцкевич. – Минск : Беларусь, 2014. – 814 с., [12] л. ил.
4. Высочайше утвержденное мнение Государственного Совета. – О распространении законоположений 12 июля 1889 г. о преобразовании крестьянских и судебных учреждений на губернии Витебскую, Минскую и Могилевскую. – 12 июня 1900 г. – № 18854 // ПСЗРИ. Собр. 3-е : в 33 т. – Т. 20 (1900). – Отд. I. – № 18864. – С. 762–764.
5. Об отсрочке введения законоположений 12 июля 1889 г. в губерниях Витебской, Минской и Могилевской // РГИА. – Ф. 1291. Оп. 54, 1900 г. Д. 229.
6. Высочайше утвержденное Положение о порядке взимания окладных сборов с надельных земель сельских обществ. – Именной Высочайший указ, данный Сенату 23 июня 1899 г. // ПСЗРИ. Собр. 3-е: в 33 т. – Т. 19 (1899). – Ч. 1: Законы (16310–17967). – № 17286. – С. 804–815.
7. Высочайше утвержденное мнение Государственного Совета. – Об отсрочке введения законоположений 12 июля 1889 г. и Вверенных Правил 12 июня 1900 г. в губерниях Витебской, Минской и Могилевской // ПСЗРИ. – Собр. 3-е : в 33 т. – Т. 21. – 1901. – Отд. I. – № 19530. – С. 8.
8. *Арапов, А. В.* Краткий исторический очерк крестьянского вопроса и деятельности крестьянских учреждений Витебской губернии со дня обнародования высочайшего манифеста 19-го февраля 1861 года и до наших дней : (50-летие) / Сост. непрем. чл. Витеб. губ. присутствия А. В. Арапов. – Витебск : Губ. тип., 1911. – [2], 62 с.
9. Памятная книжка Витебской губернии на 1902 год / Издание Витебского губернского статистического комитета. – Витебск : Губернская типо-литография, 1901. – VI, 32, 216, 90 с.
10. Памятная книжка Минской губернии на 1902 год / Издание Минского губернского статистического комитета. – Минск : Паровая типо-литография Б. И. Соломонова, 1901. – 218, 212, [3] с., [1] л. ил.
11. Памятная книжка Могилевской губернии на 1902 год / Издание Могилевского губернского статистического комитета. – Могилев : Типография губернского правления, 1902. [2], XI, XXXVIII, 342,104, [193], XXXVI, [1] с., [1] л. доп.
12. Всеподданнейший отчет Витебского губернатора за 1901 год // Российский государственный исторический архив (далее – РГИА). Читальный зал. Коллекция Отчеты губернаторов. – Д. 121. – Ч. 1.
13. Всеподданнейший рапорт за 1901 год о состоянии Могилевской губернии // РГИА. Читальный зал. Коллекция Отчеты губернаторов. – Д. 122. – Ч. 2.
14. Всеподданнейший отчет за 1901 год о состоянии Минской губернии // РГИА. Читальный зал. Коллекция Отчеты губернаторов. – Д. 121. – Ч. 1.
15. Высочайше утвержденное мнение Государственного Совета. 8 июня 1903 г. – О распространении законоположений 12 июля 1889 года на губернии Виленскую, Гродненскую и Ковенскую и об ассигновании необходимых на сие кредитов // ПСЗРИ. – Собр. 3-е : в 33 т. – Т. 23 (1903 г.). – Отд. 1. – № 23106. – С. 687–689; Отд. 2: Штаты и табели. – С. 356–359.


*References*


1. *Talmachova, S. A.* Uvyadzenne zakona ab zemskikh nachalnikakh u Belarusi / S. A. Talmachova // Vestsi BDPU. – 2013. – Ser. 2, Gistoryya. Filasofiya. Palitalogiya. Satsyyalogiya. Ekanomika. Kulturalogiya. – № 4. – S. 11–15.
2. Vysochayshe utverzhdyonnyye: I. Polozheniye o zemskikh uchastkovykh nachalnikakh, II. Pravila ob ustroystve sdebnoy chasti v mestnostyakh, v kotorykh vvedeno oznachennoye Polozheniye, III. Vremennyye pravila o volostnom sude v tekh zhe mestnostyakh i IV. Pravila o poryadke privedeniya v deystviye Polozheniya o zemskikh uchastkovykh nachalnikakh // PSZRI. Sobr. 3-ye: v 33 t. – T. 9 (1899). – Otd. I. – № 6196. – S. 508–535; Otd. II: Shtaby i tabeli. – K № 6196 – 1889. Iyulya 12. – S. 249.
3. Mogilyovskaya guberniya: gosudarstvennyye, religioznyye i obshchestvennyye uchrezhdeniya (1772-1917) / Ye. K. Anishchenko [i dr.]; sost. B. N. Snapkovskiy, D. L. Yatskevich. – Minsk : Belarus, 2014. – 814 s., [12] l. il.
4. Vysochayshe utverzhdyonnoye mneniye Gosudarstvennogo Soveta. – O rasprostranenii zakonopolozheniy 12 iyulya 1889 g. o preobrazovanii krestyanskikh i sudebnykh uchrezhdeniy na gubernii Vitebskuyu, Minskuyu i Mogilyovskuyu. – 12 iyunya 1900 g. – № 18854 // PSZRI. Sobr. 3-ye: v 33 t. – T. 20 (1900). – Otd. I. – № 18864. – S. 762–764.
5. Ob otsrochke vvedeniya zakonopolozheniy 12 iyulya 1889 g. v guberniyakh Vitebskoy, Minskoy i Mogilyovskoy // RGIA. – F. 1291. Op. 54, 1900 g. D. 229.
6. Vysochayshe utverzhdyonnoye Polozheniye o poryadke vzimaniya okladnykh sborov s nedelnykh zemel selskikh obshchestv. – Imennoy Vysochayshiy ukaz, dannyy Senatu 23 iyunya 1899 g. // PSZRI. Sobr. 3-ye: v 33 t. – T. 19 (1899). – Ch. 1: Zakony (16310–17967). – № 17286. – S. 804–815.
7. Vysochayshe utverzhdyonnoye mneniye Gosudarstvennogo Soveta. – Ob otsrochke vvedeniya zakonopolozheniy 12 iyulya 1889 g. i Vverennykh Pravil 12 iyulya 1889 g. v guberniyakh Vitebskoy, Minskoy i Mogilyovskoy // PSZRI. – Sobr. 3-ye: v 33 t. – T. 21. – 1900. – Otd. I. – № 19530. – S. 8.
8. *Arapov, A. V.* Kratkiy istoricheskiy ocherk krestyanskogo voprosa i deyatelnosti krestyanskikh uchrezhdeniy Vitebskoy gubernii so dnya obnarodovaniya vysochayshego manifesta 19-go fevralya 1861 goda i do nashikh dney : (50-letiye) / Sost. neprem. chl. Viteb. gub. prisutstviya A. V. Arapov. – Vitebsk : Gub. tip., 1911. – [2], 62 s.
9. Pamyatnaya knizhka Vitebskoy gubernii na 1902 god. / Izdaniye Vitebskogo gubernskogo statisticheskogo komiteta. – Vitebsk : Gubernskaya tipo-litografiya, 1901. – VI, 32, 216, 90 s.
10. Pamyatnaya knizhka Minskoy gubernii na 1902 god. / Izdaniye Minskogo gubernskogo statisticheskogo komiteta. – Minsk : Parovaya tipo-litografiya B. I. Solomonova, 1901. – 218, 212, [3] s., [1] l. il.
11. Pamyatnaya knizhka Mogilyovskoy gubernii na 1902 god. / Izdaniye Mogilyovskogo gubernskogo statisticheskogo komiteta. – Mogilyov : Tipografiya gubernskogo pravleniya, 1902. [2], XI, XXXVIII, 342,104, [193], XXXVI, [1] s., [1] l. dop.
12. Vsepoddanneyshiy otchyot Vitebskogo gubernatora za 1901 god // Rossiyskiya gosudarstvennyy istoricheskiy arkhiv (daleye – RGIA). Chitalnyy zal. Kollektsiya Otchyoty gubernatorov. – D. 121. – Ch. 1.
13. Vsepoddanneyshiy otchyot za 1901 god o sostoyanii Mogilyovskoy gubernii // RGIA. Chitalnyy zal. Kollektsiya Otchyoty gubernatorov. – D. 121. – Ch. 2.
14. Vsepoddanneyshiy otchyot za 1901 god o sostoyanii Minskoy gubernii // RGIA. Chitalnyy zal. Kollektsiya Otchyoty gubernatorov. – D. 121. – Ch. 1.
15. Vysochayshe utverzhdyonnoye mneniye Gosudarstvennogo Soveta. 8 iyunya 1903 g. – O rasprostranenii zakonopolozheniy 12 iyulya 1889 g. na gubernii Vilenskuyu, Grodzenskuyu i Kovenskuyu i ob assignovanii neobkhodimykh na siye kreditov // PSZRI. Sobr. 3-ye: v 33 t. – T. 23 (1903 g.). – Otd. 1. – № 23106. – S. 687–689; Otd. 2: Shtaby i tabeli. – S. 356–359.

16. Речь Виленского генерал-губернатора графа К. К. Пален и доклады, читанные на съезде 27–29 ноября 1903 года при введении в Виленской губернии Положения о земских начальниках. – Вильна : Губернская типография, 1904. – 80 с.
17. Обзор Виленской губернии за 1903 год. – Вильна : Губ. тип., 1904. – [4], 95, [59] с.
18. Памятная книжка Виленской губернии на 1904 год / Редакция действительного члена Статистического комитета Г. А. Хотунцова. – Вильна : [Тип. А. Г. Сыркина], 1904. – XIV, 247, 54, 13, 87 с.
19. Адрес-календарь. Общая роспись начальствующих и прочих должностных лиц по всем управлениям в Российской империи на 1904 год / Издание инспекторского отдела собственной его императорского величества канцелярии : в 2 ч. – Ч. II: Власти и места управления: губернского, областного, окружного, городского, уездного и ведомства их. – СПб. : Сенатская типография, 1904. – [2] с., 510 стб., 66 с.
20. Список лиц, служащих по ведомству Министерства внутренних дел в губерниях, областях и градоначальствах, а также высших чинов губерний и областей, не подведомственных Министерству внутренних дел 1905 года (исправленный по 1 мая) : в 2 ч. – Ч. II: Генерал-губернаторства, губернии, области и градоначальства. – СПб. : Типография Министерства внутренних дел, 1905.
21. Краткий обзор десятилетней деятельности крестьянских учреждений Виленской губернии, преобразованных по закону 12 июля 1889 года (1.12.1903 – 1.12.1913) / Сост. Виленским губернским присутствием. – Вильна : Губернская типография, 1913. – 37 с.

16. Rech Vilenskogo general-gubernatora grafa K. K. Palen i doklady, chitannyye na syezde 27-29 noyabrya 1903 goda pri vvedenii v Vilenskoy gubernii Polozheniya o zemskikh nachalnikakh. – Vilna : Gubernskaya tipografiya, 1904. – 80 s.
17. Obzor Vilenskoy gubernii za 1903 god. – Vilna: Gub. tip., 1904. – [4], 95, [59] s.
18. Pamyatnaya knizhka Vilenskoy gubernii na 1904 god. / Redaktsiya deystvitelnogo chlena Statisticheskogo komiteta G. A. Khotuntsova. – Vilna : [Tip. A. G. Syrkina], 1904. – XIV, 247, 54. 13, 87 s.
19. Adres-kalendar. Obshchaya rospis nachalstvuyushchikh i prochikh dolzhnostnykh lits po vsem upravleniyam v Rossiyskoy imperii na 1904 god / Izdaniye inspektorskogo otdela sobstvennoy yego imperatorskogo velichestva kantselyarii : v 2 ch. – Ch. II: Vlasti i mesta upravleniya: gubernskogo, oblastnogo, okruzhnogo, gorodskogo, uyezdnogo i vedomstva ikh. – SPb. : Senatskaya tipografiya, 1904. – [2] s., 510 stb., 66 s.
20. Spisok lits, sluzhashchikh po vedomstvu Ministerstva vnutrennikh del v guberniyakh, oblastyakh i gradonachalstvakh, a takzhe vysshikh chinov guberniy i oblastey, ne podvedomstvennykh Ministerstvu vnutrennikh del 1905 goda (ispravlennyy po 1 maya): v 2 ch. – Ch. II: General-gubernatorstva, gubernii, oblasti i gradonachalstva. – SPb. : Tipografiya Ministerstva vnutrennikh del, 1905.
21. Kratkiy obzor desyatiletney deyatelnosti krestyanskikh uchrezhdeniy Vilenskoy gubernii, preobrazovannykh po zakonu 12 iyulya 1889 goda )1.12.1903 – 1.12.1913) / Sost. Vilenskim gubernskim prisutstviyem. – Vilna: Gubernskaya tipografiya, 1913. – 37 s.